**Лубінская А. П.**
г. Мінск,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў

# ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР І ЯГО ПРАКТЫЧНАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ НА ЗАНЯТКАХ ПА АНГЛІЙСКАЙ МОВЕ З КІТАЙСКІМІ МАГІСТРАНТАМІ

Апошнім часам ідэя камунікацыі набыла шырокае распаўсюджванне. Гэта праяўляецца ў самых розных аспектах жыцця. У сучасных умовах культурнае асяроддзе хутка змяняецца і становіцца ўсе больш featured рознабаковым.

Культурная разнастайнасць з'яўляецца істотным фактарам існавання грамадства, на што ўплывае, у прыватнасці, прагрэс сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі. Касмапалітызм і глабалізацыя садзейнічаюць узаемаўплыву і ўзаемапранікненню розных культур і моў. Вельмі часта назіраецца сітуацыя, калі супольнасць больш моцнай культуры, больш распаўсюджанай мовы праз індывідуальных прадстаўнікоў і праз асобныя групы пачынае весці камунікацыю, зыходзячы з пазіцыі дамінавання. Нярэдка адбываецца прамое навязванне ідэалаў і стэрэатыпаў з мэтай асімляваць больш слабую, на першы погляд, культурна-моўную прастору.

Культурная разнастайнасць часта становіцца прычынай страху і адкінутасці. Стэрэатыпы, ксенафобія, адсутнасць талерантнасці могуць пагражаць супакою. Каб пазбегнуць празмернага ўхілу як у бок дамінавання, так і ў бок падпарадкавання, у міжкультурнай камунікацыі патрэбны сапраўдны дыялог, заснаваны на пэўных прынцыпах, якімі будуць кіравацца носьбіты той ці іншай культуры і мовы, будуючы канструктыўныя зносіны з больш блізкім і больш далекім асяроддзем ў шматкультурным свеце і развіваючы пачуцце супольнасці і прыналежнасці.

У дачыненні да дыялогу культур можна даставаць прынцыпы, якія з'уляюцца часткаю псіхалогіі камунікацыі, а менавіта:

– больш слухаць, чым казаць;
– больш разумець, чым ацэньваць;
– больш дзяліцца, чым дыскутаваць.

Мэта такім чынам зразуметага дыялогу – спазнаць іншага чалавека, носьбіта іншай культуры, імкнуцца зразумець яго, але не спрабаваць змяніць. Праз захаванне вышэйзгаданых прынцыпаў дыялог культур дазваляе адкрыць багацце кожнай асобна ўзятай культурна-моўнай супольнасці, яе індывідуальнасць, дынаміку і каларыт. Адбываецца працэс узаемнага ўзбагачэння, што ў сваю чаргу спрыяе дасягненню станоўчых вынікаў камунікатыўнага працэсу. Шлях дыялогу – гэта шлях дзялення светапоглядамі, разумення іншых людзей, якія глядзяць на свет з іншай перспектывы. Істотным з'яўляецца тое, каб слухаць адно аднаго, у працэсе чаго становіцца магчымым ідэнтыфікаваць падабенства і адрозненні паміж разнастайнымі культурнымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыямі. Дыялог культур грунтуецца на адкрытасці, цікаўнасці і заангажаванасці.

Практычнае праяўленне дыялогу культур знаходзіць свае адлюстраванне падчас заняткаў па замежнай мове са студэнтамі з іншых краін. Хацелася б разгледзець такую сітуацыю, якая назіраецца на занятках па англійскай мове з кітайскімі магістрантамі.

Кітайская культура фарміравалася на працягу тысячагоддзяў і безумоўна валодае сваім адметным характарам і спецыфічнымі рысамі, абумоўленымі менталітэтам. Адначасова, з улікам многіх фактараў, гэта культура, схільная да дамінавання. З аднаго боку, кітайцы ганарацца сваей багатай гісторыяй, культурай, мовай. З іншага ж боку, можа ўзнікаць тэндэнцыя да больш пагардлівага стаўлення да прадстаўнікоў іншых культур, што можа праяўляцца і свядома, але часцей несвядома.

Няведанне мовы чужой краіны, яе традыцый і звычаяў часта становіцца перашкодай для маладых людзей з Кітая, якія прыязджаюць у Беларусь, каб атрымаць менавіта тут вышэйшую адукацыю або каб прайсці навучанне ў магістратуры. Грамадства таксама не заўседы бывае талерантным у дачыненні да іншаземцаў і ставіцца да прыезджых студэнтаў або магістрантаў з насцярожанасцю, антыпатыяй і нават варожасцю [1].

Але каб адбыўся сапраўдны дыялог культур, на аднолькавым узроўні, без дамінавання, без прыніжэння, без страху, неабходная адкрытасць. І ў гэтым вялікую ролю адыгрываюць выкладчыкі, у прыватнасці, замежнай мовы. Англійская мова ў дадзенай сітуацыі, калі ніводзін з бакоў не з’яўляецца яе носьбітам, становіцца мовай-пасрэднікам. Гэта надае працэсу навучання ўніверсальны характар.

Фактычна на занятках па замежнай мове перасякаюцца, узаемадзейнічаюць і ўзаемна ўплываюць адна на адну тры культурна-моўныя прасторы: англійская, беларуская і кітайская. Выкладчык выступае ў ролі пэўнага мадэратара, які, з аднаго боку, з эмпатыяй і павагай ставіцца да замежнай культуры і мовы, прызнаючы належную ім важнасць і каштоўнасць, а з іншага боку, з’яўляючыся носьбітам айчыннай культуры і мовы, актыўна знаеміць іншаземных навучэнцаў з разнастайнымі ўзорамі і прыкладамі беларускай культурнай спадчыны, традыцый і звычаяў.

Свядомае, актыўнае і неназойлівае выкарыстанне вышэйзгаданых прынцыпаў падчас заняткаў са студэнтамі і магістрантамі з ліку замежных грамадзян спрыяе стварэнню прасторы міжкультурнага дыялогу.

Пазіцыя актыўнага слухання будуе атмасферу даверу, дазваляе суразмоўцам адкрыта дзяліцца адно з адным часткай свайго свету, свайго менталітэту. Важная зацікаўленасць, неабыякавасць з боку выкладчыка, у выніку чаго студэнты і магістранты нязмушана і з радасцю выказваюць свае ідэі і меркаванні, дзеляцца сваім досведам.

З іншага боку, выкладчык дзеліцца і тым, што з’яўляецца часткай яго ці яе ўласнага культурнага коду. І англійская мова, на якой праходзяць заняткі, з аднаго боку, дазваляе захаваць пэўную нейтральнасць у прадстаўленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі, але таксама робіць кожны занятак маленькім элементам глабальнай міжкультурнай прасторы.

У сапраўдным дыялогу, калі мы размаўляем, мы абавязкова дзелімся. Дзяліцца не азначае дыскутаваць. Калі мы дзелімся, то паказваем, як бачым канкрэтныя справы з боку свайго ўласнага досведу, сваіх перажыванняў, якія пазней можна паспрабаваць зрабіць аб’ектыўнымі. Уменне шчыра, адкрыта, выразна і недвухсэнсоўна дзяліцца ў псіхалогіі называецца асертыўнасцю.

Дзелячыся, мы не навязваем іншым свае меркаванне, але ставімся да іх як да роўных сабе, прадастаўляем голас іншаму чалавеку. Дзелячыся, мы пазбягаем дамінавання. Дзелячыся, неабходна захоўваць далікатнасць. Вострыя, непрадуманыя словы ўзмацняюць напружанне паміж суразмоўцамі, ствараюць бар’еры.

На занятках па замежнай мове з кітайскімі магістрантамі сітуацыі дзялення ўзнікаюць дастаткова часта. Важна не навязваць суб’ектыўных меркаванняў адносна ўласнай культуры або мовы, а зыходзіць з прынцыпаў роўнасці. Такое дзяленне вядзе да ўзаемнага ўзбагачэння і стварае ўнікальную матэрыю дыялогу.

*Список цитированных источников*

1. Гжибовски, Е. Диалог как путь духовности в супружестве, и не только / Е. Гжибовски ; пер. с пол. Л. Бурлевич и А. Шитиковой. – Минск : «ПРО ХРИСТО», 2015. – 304 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ